СТУДЗЕНЬ - КРАСАВІК 2026
TRENDS.BELHELCOM.ORG

# ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ: АСНОЎНЫЯ ТРЭНДЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАЛІТЫКІ

АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ | ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА | КЛЮЧАВЫЯ РЭАКЦЫІ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР

БЕЛАРУСКІ ХЕЛЬСІНКСКІ КАМІТЭТ

Беларускія ўлады прызналі БХК і шэраг іншых праваабарончых арганізацый так званымі «экстрэмісцкімі фармаваннямі».

Захоўванне і распаўсюджванне матэрыялаў арганізацыі стварае рызыкі для людзей, якія знаходзяцца ў Беларусі або плануюць паездку ў краіну.

Калі ласка, улічвайце гэта пры абыходжанні з дадзеным матэрыялам.

Агляды «Права чалавека ў Беларусі: асноўныя трэнды дзяржаўнай палітыкі» выходзяць пры падтрымцы Еўрапейскага саюза.
Іх змест адлюстроўвае выключна погляды і меркаванні аўтараў і не абавязкова супадае з афіцыйнай пазіцыяй Еўрапейскага саюза.

Co-funded by
the European Union

© Беларускі Хельсінкскі Камітэт, 2026

# ЗМЕСТ


**УВОДЗІНЫ** 4

**РЭЗЮМЭ** 6

**I. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДПАСЫЛКІ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ** 9

Змены ў рэгуляванні працэсу нарматворчасці 9

Змены ў сістэме прафілактыкі правапарушэнняў 11

Інстытуцыяналізацыя «барацьбы з экстрэмізмам» 13

Узмацненне мабілізацыйнага кантролю як частка палітыкі мілітарызацыі 14

**II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА: ПАРУШЭННІ ГРАМАДЗЯНСКІХ, ПАЛІТЫЧНЫХ, САЦЫЯЛЬНЫХ, ЭКАНАМІЧНЫХ І КУЛЬТУРНЫХ ПРАВОЎ** 16

Чарговае масавае вызваленне палітзняволеных: пераважная большасць засталася ў краіне 16

Пашырэнне інструментарыю трансгранічных рэпрэсій, у тым ліку звязаных з прымусовым вывазам за мяжу 17

Умацаванне трэнду калектыўнай адказнасці сваякоў «палітычных» 17

Інтэнсіфікацыя прызнання арганізацый / фармаванняў экстрэмісцкімі 19

**III. КЛЮЧАВЫЯ ЗМЕНЫ Ў РЭАКЦЫЯХ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР, ЯКІЯ ТЫЧАЦЦА СІТУАЦЫІ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ** 21

Пачатак расследавання міжнародным крымінальным судом сітуацыі Літва/Беларусь 21

# УВОДЗІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі застаецца прадметам маніторынгу і аналізу з боку беларускіх і міжнародных НДА і міжнародных арганізацый. З 2012 г. дзейнічае мандат Спецыяльнага дакладчыка па сытуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Таксама агляды падаюцца ў рамках альтэрнатыўных дакладаў грамадзянскай супольнасці ў дамоўныя органы, якія кантралююць выкананне асноўных канвенцый ААН у галіне правоў чалавека, а таксама ў дакладах саміх гэтых органаў. У сувязі з неабгрунтаваным ужываннем сілы, катаваннямі ў дачыненні да мірных пратэстоўцаў супраць сфальсіфікаваных выбараў у 2020 г. і распачатымі за імі рэпрэсіямі, у сакавіку 2021 г. быў заснаваны спецыяльны Мандат па сітуацыі ў Беларусі пад эгідай Вярхоўнага камісара ААН, які ў 2024 г. быў заменены групай незалежных экспертаў, што азначае большую самастойнасць і незалежнасць гэтага механізму.

З 2019 г. БХК разлічвае Нацыянальны індэкс па правах чалавека, у межах якога больш за 40 беларускіх экспертаў:к ацэньваюць змены асобна па кожным пункце каталога правоў чалавека. Беларускія НДА рэгулярна робяць профільныя маніторынгі сітуацыі з правамі чалавека, зыходзячы са сваёй спецыялізацыі.[1]

Спачатку падзеі 2020 года, пазней вайна ва Украіне і суўдзел Беларусі ў расійскай агрэсіі істотна змянілі становішча ў краіне, у тым ліку палітыку і практыку ў сферы правоў чалавека. Сітуацыя ўвесь час пагаршаецца: штодня становіцца вядома аб зменах заканадаўства, ініцыятывах уладаў,[2] канкрэтных парушэннях і г.д. У гэтым патоку інфармацыі **складана ўтрымаць фокус увагі**, размываецца мяжа паміж галоўным і негалоўным.

Каб не прапусціць найбольш значныя падзеі, лепш разумець сітуацыю ў Беларусі, і куды рухаецца дзяржава ў кантэксце вяршэнства права і правоў чалавека, мы адсочваем **найбольш значныя і якасныя змены асноўных трэндаў дзяржаўнай палітыкі ў сферы правоў чалавека**.

Для гэтага з ліпеня 2023 года Беларускі Хельсінкскі Камітэт выпускае перыядычны агляд. Яго мэта - прадстаўляць нашыя экспертныя ацэнкі **найбольш значных і якасных змен у тэндэнцыях беларускай дзяржаўнай палітыкі** ў галіне правоў чалавека і рэакцыях на яе міжнароднай супольнасці за справаздачны перыяд па трох напрамках:

---

1 *Гл., у прыватнасці, Аналітычныя агляды сітуацыі з правамі чалавека, якія рыхтуе ПЦ «Вясна»: https://spring96.org/ru/publications; Агляды сітуацыі са свабодай асацыяцый і арганізацыямі грамадзянскай супольнасці Рэспублікі Беларусь, якія робіць Lawtrend: https://www.lawtrend.org/freedom-of-association/ezhegodnyj-monitoring; маніторынгі і Электронныя бюлетэні СМІ ў Беларусі, якія робіць БАЖ: https://baj.media/ru/aglyady_category/monitoringi-bazh/ і інш*

2 *Мы маем на ўвазе, што цяперашнія ўлады ў Беларусі з'яўляюцца ўладамі дэ-факта.*

- *агульныя меры:* сістэмныя рэчы - заканадаўства, стратэгіі, палітыкі, якія ў цэлым вызначаюць умовы і перадумовы рэалізацыі правоў чалавека ў краіне;
- *праваприымяняльная практыка:* тэндэнцыі парушэнняў грамадзянскіх і палітычных, сацыяльных, эканамічных і культурных правоў;
- *ключавыя рашэнні і рэакцыі міжнародных структур,* звязаныя з сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі.

Нашая аналітыка дапамагае лепш зразумець трэнды ў галіне правоў чалавека ў Беларусі (для міжнародных партнёраў - у прынцыпе лепш арыентавацца ў беларускім парадку дня), дае магчымасць адсочваць сістэмныя і якасныя змены сітуацыі, пашыраць правачалавечны фокус аналітыкі ў сумежных галінах (палітычнай, эканамічнай, сацыяльнай і інш.), будзе карысная для выпрацоўкі стратэгій і пазіцый.

Агляд выходзіць з 2023 г. У 2023 г. - 2 выпускі (за кожнае паўгоддзе), у 2024 і 2025 гг. - раз у трыместр (па выніках кожных 4-х месяцаў). Папярэднія выпускі і зводную аналітыку за кожны год можна знайсці тут.

**Вы можаце падпісацца на наш агляд тут**

ПАДПІШЫЦЕСЯ НА НАСТУПНЫ ВЫПУСК ТРЭНДАЎ НА

TRENDS.BELHELCOM.ORG

# РЭЗЮМЕ

- Змянілася рэгуляванне працэсу нарматворчасці (унесены змены ў Закон «Аб нарматворчай дзейнасці») як вынік маштабнай рэвізіі заканадаўства, праведзенай у 2024-2025 гг. Нягледзячы на шэраг станоўчых момантаў, у тым ліку скарачэнне дублюючых і залішніх нормаў, змены ўзмацнілі цэнтралізацыю працэсу нарматворчасці і павялічылі адміністрацыйную нагрузку. Уведзена новая працэдура — падрыхтоўка тэрміновых праектаў НПА, якая выглядае як падмурак для больш зручнай фармалізацыі адвольных і валюнтарысцкіх рашэнняў выканаўчай улады.

- Змянілася сістэма прафілактыкі правапарушэнняў. Пашыраюцца межы кантролю: павялічылася кола асоб, якія мусяць быць на прафілактычным уліку (дадаюцца асобы, якія вярнуліся з ЛТП, і неплацельшчыкі адміністрацыйных штрафаў); узмацніўся рэжым прафілактычнага ўліку (пашырыліся абавязкі асоб, якія стаяць на ім, ўведзена адміністрацыйная адказнасць за іх невыкананне); абавязковая занятасць не менш за 6 месяцаў фіксуецца як падстава для таго, каб зняць з уліку некаторыя катэгорыі асоб, што фармалізуе прафілактычны ўлік у якасці аднаго з інструментаў барацьбы з «тунеядцамі». У той жа час у якасці станоўчага моманту можна адзначыць зніжэнне парога для пастаноўкі на прафілактычны ўлік у выпадку хатняга гвалту.

- Узмацняецца мабілізацыйны кантроль як частка палітыкі мілітарызацыі. У базавыя грамадзянскія адміністрацыйныя працэдуры **дадаецца элемент ваеннага кантролю**. Цяпер у пакеце дакументаў для атрымання/абмену пашпарта і ID, пасведчання кіроўцы для мужчын ва ўзросце ад 18 да 27 гадоў мусіць быць даведка аб стаўленні да воінскага абавязку.

- У красавіку ўведзена адміністрацыйная адказнасць за «прапаганду гомасэксуальных стасункаў, змены полу, бяздзетнасці». Мы аналізавалі гэтыя папраўкі ў КаАП на стадыі законапраекта ў выпуску за травень-жнівень 2025 і рабілі асобны падрабязны аналіз. Нагадаем, што гэта істотны, якасны зрух у фармалізацыі дыскрымінацыі: **фактычна ўводзіцца адказнасць за ідэнтычнасць і праявы прыватнага жыцця**. Пры гэтым новы склад «прапаганды» грунтуецца на ацэначным паняцці «фарміраванне ў грамадзян **уяўленняў аб прывабнасці** гомасэксуальных адносін, змены полу, бяздзетнасці або аб прызнанні педафіліі дапушчальнай». Важнай для разумення шырыні абмежаванняў будзе з'яўляцца правапрымяняльная практыка.

- Узмацняецца тэндэнцыя да **«пабочных рэпрэсій»** (дапушчальнай пабочнай шкоды падчас рэпрэсій). З імкненнем зрабіць жыццё «палітычна ненадзейных» яшчэ больш нязручным, на ўзроўні палітыкі і практыкі прымаюцца меры, якія непасрэдна закранаюць, пазбаўляюць правоў або падвяргаюць рызыцы рэпрэсій шырокае кола людзей, у тым ліку тых, хто не мае ніякага палітычнага профілю. Першай ластаўкай «пабочных рэпрэсій» можна назваць «пашпартны ўказ», які закрануў увогуле ўсіх грамадзян Беларусі, якія жывуць за мяжой. За студзень-красавік 2026: а) у якасці чарговай хвалі ціску на сваякоў палітзняволеных былі прызнаны экстрэмісцкімі фармаваннямі 22 чаты, у якіх людзі абменьваліся інфармацыяй для дапамогі родным у працэсе адбывання папярэдняга зняволення або пакарання. Аднак большасць удзельнікаў чатаў — сваякі звычайных зняволеных, якія цяпер таксама апынуліся пад рызыкай пераследу; б) экстрэмісцкай арганізацыяй быў прызнаны Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт (ЕГУ), што аўтаматычна зрабіла ўразлівай велізарную колькасць людзей (апроч сённяшніх студэнтаў і супрацоўнікаў), якія калісьці вучыліся, выкладалі або былі як-небудзь звязаны з ЕГУ.

- Умацоўваецца трэнд **калектыўнай адказнасці сваякоў** «палітычных» і «ненадзейных»: а) прызнанне экстрэмісцкімі матэрыяламі чатаў, у якіх абменьваліся інфармацыяй для дапамогі зняволеным, ставіць пад пагрозу пераследу сваякоў палітычных зняволеных; б) стала вядома аб практыцы звальнення / прымусу да звальнення людзей, чые сваякі жывуць у «недружалюбных краінах».

- На працягу студзеня-красавіка 2026 г. працягваліся вызваленні палітзняволеных: у рамках перамоў з адміністрацыяй ЗША вызвалены 250 чалавек, і ў адрозненне ад папярэдніх вызваленняў пераважная большасць з іх засталася ў краіне (235). Акрамя таго, яшчэ 17 чалавек былі вызваленыя па ініцыятыве саміх уладаў.

- У той жа час пашыраецца інструментарый трансгранічных рэпрэсій, звязаных у тым ліку і з прымусовым вывазам за мяжу. Многія вывезеныя палітзняволеныя (не менш за 16) даведаліся, што іх пашпарт прызнаны ўладамі несапраўдным (гл. заяву праваабаронцаў з зваротам да беларускіх уладаў і міжнародных партнёраў). Акрамя таго, стала вядома аб тым, што людзей, якія зараз знаходзяцца на стадыі апеляцыі перад адпраўкай на «хімію», прымушаюць падпісваць дакумент аб тым, што ў выпадку паўторнага парушэння КК яны могуць быць вывезеныя за мяжу.

- Інтэнсіфікавалася практыка прызнання арганізацый / фармаванняў экстрэмісцкімі. Па-першае, экстрэмісцкай арганізацыяй быў прызнаны Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт. Гэта першы выпадак, калі статус экстрэмісцкай арганізацыі цягне за сабой наступствы такога маштабу для людзей, якія не маюць палітычнага профілю. У тым ліку істотна пашыраюцца сферы жыцця, якія цяпер ахопліваюцца рызыкай пераследу (навуковыя публікацыі, аплата вучобы і г.д.). Па-другое, за справаздачны перыяд адбыўся відавочны колькасны ўсплёск прызнання грамадскіх арганізацый/ініцыятыў/супольнасцяў экстрэмісцкімі фармаваннямі або арганізацыямі (усяго 37). Яго пік (23) прыпаў на красавік. Пры гэтым на працягу аднаго месяца «экстрэмісцкімі фармаваннямі» былі прызнаны адразу тры праваабарончыя арганізацыі: Беларускі ПЭН, Human Constanta, Беларускі Хельсінкскі Камітэт (гл. заяву праваабарончай кааліцыі з гэтай нагоды). Таксама экстрэмісцкімі фармаваннямі былі прызнаны ўсе спісы кандыдатаў, якія вылучыліся на выбары ў Каардынацыйную раду.

- 12 сакавіка 2026 года стала вядома, што Міжнародны крымінальны суд распачаў расследаванне па сітуацыі Літва/Беларусь, перададзенай у МКС Літвой у верасні 2024 г. Расследаванне тычыцца толькі трансгранічных злачынстваў, учыненых з 1 мая 2020 года ў Беларусі, пры ўмове, што прынамсі адзін элемент складу злачынства быў ажыццёўлены на тэрыторыі Літвы. Расследаванню падлягаюць злачынствы супраць чалавечнасці, такія як дэпартацыя, а таксама пераслед шляхам дэпартацыі любой ідэнтыфікуемай групы або супольнасці па палітычных падставах, якія нібыта ўчынены беларускімі ўладамі.

# І. АГУЛЬНЫЯ МЕРЫ: ЗАКАНАДАЎСТВА, СТРАТЭГІІ, ПАЛІТЫКІ, ЯКІЯ Ў ЦЭЛЫМ ВЫЗНАЧАЮЦЬ УМОВЫ І ПЕРАДУМОВЫ ДЛЯ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА Ў КРАІНЕ

ГАЛОЎНАЕ:

- узмацніўся мабілізацыйны кантроль як частка палітыкі мілітарызацыі: у базавыя грамадзянскія адміністрацыйныя працэдуры дадаецца элемент ваеннага кантролю;
- узмацнілася цэнтралізацыя працэсу нарматворчасці і вертыкаль улады ў нарматворчым працэсе, уведзена працэдура тэрміновай падрыхтоўкі нарматыўнага прававога акта;
- узмацнілася сістэма прафілактыкі правапарушэнняў.

## ЗМЕНЫ Ў РЭГУЛЯВАННІ ПРАЦЭСУ НАРМАТВОРЧАСЦІ

У 2024–2025 гг. у Беларусі была праведзена маштабная рэвізія заканадаўства. Яе асноўнай мэтай была «аптымізацыя» нарматворчага масіву: скарачэнне дублюючых і залішніх нормаў, актуалізацыя заканадаўства. У выніку колькасць нарматыўных прававых актаў скарацілася на 45%. Важным вынікам праведзенай рэформы стала прыняцце ў красавіку 2026 г. закона «Аб змяненні законаў па пытаннях нарматворчай дзейнасці» (ён уносіць змены ў дзеючы закон ад 2018 г.) і двух указаў прэзідэнта: № 130 ад 16.04.2026 г. «Аб нарматворчай дзейнасці» і № 131 ад 16.04.2026 г. «Аб крыміналагічнай экспертызе».

Ключавыя змены ў асноўны закон:

- уводзіцца абавязак дзяржаўных органаў праводзіць інвентарызацыю прынятых імі нарматыўных прававых актаў (НПА) на сістэмнай аснове з мэтай выяўлення нормаў, якія састарэлі, дублююць іншыя або не працуюць – у залежнасці ад узроўню акта і органа, які прымае іх – раз у 5, 3 і 1 год;

- узмацняецца парламентскі кантроль за рэалізацыяй законаў: функцыі Палаты прадстаўнікоў пашыраюцца да кантролю за «падрыхтоўкай і прыняццем нарматыўных прававых актаў у адпаведнасці з заключнымі палажэннямі законаў»; дзяржаўны орган, адказны за прывядзенне заканадаўства ў адпаведнасць з прынятым законам, цяпер абавязаны прадастаўляць у Палату прадстаўнікоў план таго, што збіраецца прадпрыняць, а пасля – справаздачу аб тым, што было зроблена;

- уводзіцца забарона на пераперадачу нарматворчых паўнамоцтваў уніз па вертыкалі, калі яны прадастаўлены законам (Саўмін не можа дэлегаваць падначаленаму органу, калі законам ён (Саўмін) прызначаны адказным), а таксама паміж органамі аднаго ўзроўню;

- уводзіцца персанальная адказнасць чыноўнікаў: кіраўнікі дзяржаўных органаў, адказных за падрыхтоўку праектаў НПА і за правядзенне экспертыз і ўзгадненняў НПА, цяпер нясуць персанальную адказнасць за якасць і своечасовасць такой падрыхтоўкі і за рашэнні, прынятыя ў ходзе экспертызы і ўзгаднення;

- пашыраецца пакетны прынцып падрыхтоўкі НПА: уключаныя ў пакет праекты актаў будуць распрацоўвацца да ўнясення праекта асноўнага заканадаўчага акта ў нарматворчы орган і ў выпадку неабходнасці яго дапрацоўкі — будуць дапрацоўвацца разам з ім;

- уводзіцца новая працэдура — падрыхтоўка тэрміновых праектаў НПА і, адпаведна, новы артыкул 42-1 «Арганізацыя падрыхтоўкі тэрміновых праектаў нарматыўных прававых актаў». Такая падрыхтоўка можа ажыццяўляцца «па пытаннях, якія патрабуюць аператыўнага рэгулявання», па рашэнні прэзідэнта, кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта, прэм'ер-міністра або іх першых намеснікаў. Тэрміновая падрыхтоўка павінна займаць з усімі ўзгадненнямі і экспертызамі не больш за дзесяць працоўных дзён, калі ўпамянутымі асобамі не ўстаноўлены больш кароткі тэрмін. Пры гэтым у артыкуле асобна пазначана, што абавязковыя экспертызы праекта НПА праводзяцца не пазней за працоўны дзень, які наступае за днём атрымання такога праекта, і гэты тэрмін не можа быць прадоўжаны.

Па словах афіцыйных асоб, папраўкі ў закон «закладаюць сістэмную аснову для ліквідацыі праблемы залішняга рэгулявання, гарантуючы пры гэтым своечасовае абнаўленне нормаў і якасна новы ўзровень нарматворчага працэсу». З аналізу матываў і ключавых змен можна зрабіць выснову, што шэраг з іх сапраўды

з'яўляецца спробай ухіліць наяўныя негатыўныя моманты нарматворчага працэсу. У той жа час такія змены відавочна **ўзмацняюць цэнтралізацыю працэсу нарматворчасці, вертыкаль улады ў нарматворчым працэсе і павялічваюць адміністрацыйную нагрузку (у тым ліку прымушаюць парламент выконваць не ўласцівыя яму функцыі)**. А ўвядзенне працэдуры падрыхтоўкі тэрміновых праектаў НПА выглядае як фундамент для больш зручнай фармалізацыі адвольных і валюнтарысцкіх рашэнняў выканаўчай улады.

Змены лішні раз ілюструюць крызіс дзяржаўнай сістэмы кіравання: нават пры аб'ектыўным прызнанні рэальных праблем і шчырым жаданні іх вырашыць, асноўны сродак вырашэння – узмацненне цэнтралізацыі і кіраўнічай вертыкалі. Гэты крызіс яшчэ больш паглыбляецца ва ўмовах рэпрэсіўнага modus operandi дзяржавы пасля 2020 года, выкарыстання заканадаўства для інстытуцыяналізацыі палітычных рэпрэсій. Паколькі сістэма вымушана балансаваць паміж хоць нейкім развіццём, якога патрабуе час, і захаваннем агульнага рэпрэсіўнага фону, мы назіраем двухстайнасць і рознанакіраванасць яе дзеянняў.

## ЗМЕНЫ Ў СІСТЭМЕ ПРАФІЛАКТЫКІ ПРАВАПАРУШЭННЯЎ

У студзені 2026 г. прыняты ў першым чытанні праект Закона «Аб змяненні законаў па пытаннях прафілактыкі правапарушэнняў». Ён уносіць змены ў дзеючы Закон «Аб асновах дзейнасці па прафілактыцы правапарушэнняў» 2014 г. і Кодэкс аб адміністрацыйных правапарушэннях. Плануемыя навацыі змяняюць існуючую сістэму і мадэль прафілактыкі правапарушэнняў:

- пашыраецца кола асоб, якія мусяць быць на прафілактычным уліку. Дададзены людзі, якія вярнуліся з лячэбна-працоўнага прафілакторыя (ЛТП), людзі, якім прысуджаны штраф і ў дачыненні да якіх узбуджана выканаўчая вытворчасць праз яго нявыплату. Таксама зменена норма аб асобах, якія ўчынілі хатні гвалт: зніжаны парог для іх пастаноўкі на прафілактычны ўлік. Цяпер падставай з'яўляецца наяўнасць двух і больш інцыдэнтаў на працягу аднаго года, у сувязі з якімі асоба прыцягвалася да адміністрацыйнай адказнасці за ўмыснае нанясенне цялеснага пашкоджання і іншыя гвалтоўныя дзеянні альбо парушэнне ахоўнага прадпісання. Таксама сюды адносяцца асобы, у дачыненні да якіх судом прынята рашэнне аб спыненні справы аб адміністрацыйным правапарушэнні ў сувязі з прымірэннем з пацярпелым;

- узмацніўся рэжым прафілактычнага ўліку. Пашыраецца кола абавязкаў чалавека, які стаіць на ўліку. Цяпер да іх адносяцца: абавязак з'явіцца ў вызначаны тэрмін у службу занятасці або на перамовы з наймальнікам (калі профулік накіраваны на працаўладкаванне); абавязак з'явіцца ў вызначаны тэрмін ва ўстанову аховы здароўя на медагляд у адпаведнасці з нормамі аховы працы, калі наймальнік выдаў накіраванне; абавязак з'явіцца ў вызначаны тэрмін для прымусовага лячэння, калі яно прызначана ў адпаведнасці са ст. 107 КК, і выконваць мерапрыемствы, прадугледжаныя ў рамках дыспансернага назірання пры праходжанні такога лячэння.

  Пры гэтым зафіксаваная адміністрацыйная адказнасць за невыкананне гэтых абавязкаў. У КаАП унесены змены ў артыкул 25.11, назва якога зменена з «Несаблюдзенне патрабаванняў прэвентыўнага нагляду або прафілактычнага назірання» на «Несаблюдзенне патрабаванняў прэвентыўнага нагляду, абавязкаў прафілактычнага назірання або ўліку»;

- змяніліся падставы для спынення прафілактычнага ўліку. Па-першае, уводзіцца магчымасць датэрміновага спынення прафілактычнага ўліку асоб, якія здзяйсняюць адміністрацыйнае правапарушэнне, у тым ліку хатні гвалт. Цяпер пытанне аб здыманні можа разглядацца праз шэсць месяцаў (а не праз год) кіраўніком органа ўнутраных спраў або яго намеснікам, але пры сукупнасці шэрагу ўмоў: чалавек не менш за шэсць месяцаў працаваў або навучаўся такім чынам, каб лічыцца занятым у адпаведнасці з заканадаўствам аб занятасці, прайшоў карэкцыйную праграму і ў перыяд ажыццяўлення прафілактычнага ўліку не ўчыняў хатняга гвалту; паўналетняя асоба, якая пацярпела ад хатняга гвалту, пісьмова пагадзілася на спыненне ажыццяўлення прафілактычнага ўліку.

  Па-другое, для асоб, якія здзяйсняюць адміністрацыйныя правапарушэнні, і асоб, якія знаходзіліся ў ЛТП, у якасці абавязковай падстава для зняцця з прафілактычнага ўліку ўводзіцца занятасць не менш за шэсць месяцаў у адпаведнасці з заканадаўствам аб занятасці насельніцтва

Усе новыя абавязкі будуць дзейнічаць і для тых, хто на момант уступлення ў сілу ўжо пастаўлены на прафілактычны ўлік. Але зафіксавана рознае стаўленне да трох новых катэгорый асоб, якія падлягаюць прафілактычнаму ўліку ў аспекце

зваротнай сілы закона. Асобы, якія знаходзяцца ў ЛТП або ў дачыненні да якіх маецца невыкананае рашэнне суда да ўступлення новага закона ў сілу, — падлягаюць прафілактычнаму ўліку ў адпаведнасці з новымі нормамі. Але асобы, якія ўчынілі адміністрацыйныя правапарушэнні ў кантэксце хатняга гвалту або парушылі ахоўнае прадпісанне да ўступлення новага закона ў сілу, а таксама асобы, якія не ўплацілі прызначаны штраф у ходзе выканаўчай вытворчасці да ўступлення новага закона ў сілу, — не падлягаюць уліку ў адпаведнасці з новымі патрабаваннямі.

Такім чынам, у цэлым сістэма прафілактыкі правапарушэнняў пашырае межы кантролю, яшчэ больш маргіналізуе асобныя групы (напрыклад, тых, хто прайшоў лячэнне ў ЛТП), а таксама фармалізуецца ў якасці аднаго з інструментаў барацьбы з «тунеядцамі», што яшчэ больш ператварае яе ў інструмент ціску і пакарання, а не прафілактыкі правапарушэнняў.

У той жа час важна адзначыць у якасці станоўчага моманту зніжэнне парога для пастаноўкі на прафілактычны ўлік у выпадку хатняга гвалту (цяпер не патрабуецца абавязковае папярэдняе афіцыйнае папярэджанне, не мае значэння прымірэнне з пацярпелымі і падставы прыцягнення да адміністрацыйнай адказнасці не абмежаваны трыма канкрэтнымі артыкуламі). Тым не менш захоўваецца ўмова «паўторнасці» парушэння (аднаго разу недастаткова), таму такое палажэнне ўсё яшчэ нельга назваць паўнавартасным інструментам абароны ад хатняга гвалту.

## ІНСТЫТУЦЫЯНАЛІЗАЦЫЯ «БАРАЦЬБЫ З ЭКСТРЭМІЗМАМ»

Рашэннем мінскіх гарадскіх уладаў ад 19.03.2026 г. створана Мінская гарадская камісія па правядзенні ацэнкі сімволікі, атрыбутыкі, інфармацыйнай прадукцыі. У яе кампетэнцыю ўваходзяць аналіз і ацэнка сімволікі, атрыбутыкі, інфармацыйнай прадукцыі, выяўленых на тэрыторыі г. Мінска, на прадмет наяўнасці (адсутнасці) у іх прыкмет праявы экстрэмізму. Да гэтага такія камісіі існавалі толькі на рэспубліканскім (сюды ж уключаўся і г. Мінск) і абласных узроўнях. Прыкметна, што рашэнне аб пашырэнні пераліку такіх камісій і стварэнні асобнай на ўзроўні г. Мінска было прынята яшчэ ў 2023 г. і замацавана ў абноўленым Палажэнні аб парадку правядзення ацэнкі сімволікі, атрыбутыкі, інфармацыйнай прадукцыі.

Пасля 2020 года адвольнае прымяненне заканадаўства аб барацьбе з экстрэмізмам з'яўляецца часткай сістэмы палітычных рэпрэсій. Менавіта заключэнні Рэспубліканскай камісіі па правядзенні ацэнкі сімволікі і атрыбутыкі, інфармацыйнай прадукцыі на прадмет наяўнасці (адсутнасці) у іх прыкмет

«экстрэмізму» з'яўляюцца асноўным і практычна адзіным доказам для суда пры прыняцці рашэнняў аб унясенні таго ці іншага матэрыялу або прадукцыі ў «экстрэмісцкія спісы».

Паводле ўладаў, на канец лютага 2026 г. у спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў уключана больш за 9000 аб'ектаў. Для параўнання: да 2020 года Рэспубліканскі спіс экстрэмісцкіх матэрыялаў уключаў некалькі сотняў пазіцый. Пры такіх аб'ёмах працы натуральна патрабуецца і больш разгалінаваная інстытуцыйная структура, якая магла б палегчыць нагрузку Рэспубліканскую камісію.

## УЗМАЦНЕННЕ МАБІЛІЗАЦЫЙНАГА КАНТРОЛЮ ЯК ЧАСТКА ПАЛІТЫКІ МІЛІТАРЫЗАЦЫІ

9 студзеня 2026 г. падпісаны ўказ № 5, які ўносіць змены ў рэгуляванне адміністрацыйных працэдур. Зменамі скарочаны пералік дакументаў і тэрміны шэрагу працэдур. Сярод іншага ўводзіцца новая працэдура выдачы даведкі аб статусе воінскага абавязку (п. 20.5-1). Яна выдаецца ваенным камісарыятам або органам дзяржаўнай бяспекі і дзейнічае 6 месяцаў. Каб яе атрымаць, неабходна прад'явіць ваенны білет (пасведчанне прызыўніка) альбо іншы дакумент воінскага ўліку, а пры іх адсутнасці — пашпарт або іншы дакумент, які сведчыць асобу.

Адпаведна, такая даведка цяпер фігуруе ў пашыраным пераліку дакументаў, якія прадастаўляюцца для некаторых адміністрацыйных працэдур для грамадзян Беларусі мужчынскага полу ва ўзросце ад 18 да 27 гадоў (прызыўны ўзрост). Выключэнні — тыя, хто афармілі выезд за мяжу для сталага пражывання і (або) стаяць на сталым консульскім уліку. А менавіта:

- для атрымання/абмену пашпарта (як традыцыйнага, так і біяметрычнага);
- для атрымання/абмену ідэнтыфікацыйнай карты, у тым ліку новай ID-карты;
- для атрымання/абмену пасведчання кіроўцы, у тым ліку для аднаўлення правоў кіроўцы па заканчэнні тэрміну пазбаўлення правоў і вяртання пасведчання кіроўцы;
- для атрымання дазволу на набыццё грамадзянскай зброі, яе захоўванне і нашэнне, а таксама падаўжэння тэрміну дзеяння гэтых дазволаў.

Акрамя таго, што такая змена ўзмацняе агульны адміністрацыйны кантроль над грамадзянінам, па сутнасці грамадзянскія адміністрацыйныя працэдуры мілітарызуюцца — элемент ваеннага кантролю дадаецца ў самыя базавыя з іх: атрыманне/замену асноўнага дакумента, які сведчыць асобу, — пашпарта і атрыманне пасведчання кіроўцы. Гэта значыць любы мужчына прызыўнога ўзросту цяпер вымушаны перыядычна «з'яўляцца ў сістэме». Гэта відавочна сведчыць аб падрыхтоўцы інфраструктуры кантролю і ўліку як важнага элемента мабілізацыйнай сістэмы.

# II. ПРАВАПРЫМЯНЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА: ГРАМАДЗЯНСКІЯ, ПАЛІТЫЧНЫЯ, САЦЫЯЛЬНЫЯ, ЭКАНАМІЧНЫЯ І КУЛЬТУРНЫЯ ПРАВЫ

ГАЛОЎНАЕ:

- былі вызваленыя яшчэ 250 палітычных зняволеных, 235 з іх засталіся ў краіне;
- умацоўваецца трэнд «пабочных рэпрэсій»: ахоп максімальнага кола асоб;
- умацоўваецца трэнд калектыўнай адказнасці сваякоў «палітычных» і «ненадзейных»;
- інтэнсіфікавалася прызнанне арганізацый/фармаванняў экстрэмісцкімі.

## ЧАРГОВАЕ МАСАВАЕ ВЫЗВАЛЕННЕ ПАЛІТЗНЯВОЛЕНЫХ: ПЕРАВАЖНАЯ БОЛЬШАСЦЬ ЗАСТАЛАСЯ Ў КРАІНЕ

У сакавіку 2026 г. адбылося чарговае масавае вызваленне палітзняволеных у рамках перамоўнага працэсу, які ідзе паміж беларускімі ўладамі і адміністрацыяй ЗША; былі вызваленыя 250 чалавек. Пры гэтым, у адрозненне ад папярэдніх хваль падобных вызваленняў, пераважная большасць з іх (235) не была прымусова вывезена і засталася ў краіне. Прымусова вывезлі 15 чалавек, сярод якіх вядомыя праваабаронцы, журналісты, блогеры. Важна адзначыць, што ў выніку гэтага вызвалення выйшлі на волю ўсе праваабаронцы, якія да таго часу заставаліся ў зняволенні, — чальцы ПЦ Вясна і іншых арганізацый.

Акрамя вызваленых у рамках перамоў з ЗША, у першым трыместры 2026 г. яшчэ 17 чалавек былі вызваленыя па ініцыятыве саміх уладаў: 19 лютага быў адпушчаны на волю Мікалай Статкевіч, якога спрабавалі вывезці з краіны разам з 52 вызваленымі (другое вызваленне ў рамках амерыканскага трэка)

11 верасня 2025 г. Тады ён адмовіўся пакінуць Беларусь, яго вярнулі ў калонію. Пасля вяртання ў турму Статкевіч перанёс інсульт і быў адпушчаны; ён знаходзіцца ў Беларусі. Таксама вызвалілі Наталлю Левую, якая зацяжарэла ў зняволенні. 5 сакавіка вызвалілі яшчэ 15 чалавек.

## ПАШЫРЭННЕ ІНСТРУМЕНТАРЫЮ ТРАНСГРАНІЧНЫХ РЭПРЭСІЙ, У ТЫМ ЛІКУ ЗВЯЗАНЫХ З ПРЫМУСОВЫМ ВЫВАЗАМ ЗА МЯЖУ

**Па-першае**, у канцы сакавіка 2026 г. стала вядома, што ўлады прызналі невалідньмі пашпарты некаторых былых палітзняволеных, у тым ліку прымусова вывезеных з краіны за апошні час. Па звестках на канец сакавіка 2026 г. было вядома не менш чым аб 16 такіх выпадках. 10 красавіка 2026 г. кааліцыя беларускіх праваабарончых арганізацый выступіла з заявай па гэтым пытанні, звярнуўшыся да ўладаў Беларусі і міжнародных партнёраў.

Нягледзячы на тое, што адсутнасць валіднага пашпарта дэ-юрэ не цягне за сабой страты грамадзянства, яно стварае сітуацыю фактычнага безграмадзянства (de facto statelessness), закранае годнасць чалавека і перашкаджае рэалізацыі многіх базавых правоў. У гэтай сувязі неабходна таксама нагадаць і пра «пашпартны ўказ» (Указ № 278 «Аб парадку выдачы дакументаў і ажыццяўлення дзеянняў» ад 04.09.2023 г.). У выніку працяглага дзеяння гэтага ўказа тысячы грамадзян Беларусі, у тым ліку іх нованароджаныя дзеці, застаюцца без базавага дакумента, які сведчыць асобу, і, як следства, без магчымасці паўнавартаснага сацыяльнага жыцця і рэалізацыі шэрагу правоў. Такім чынам, дзяржава мэтанакіравана і ўсвядомлена працягвае палітыку адмовы ад абароны ўласных грамадзян як частку трансгранічных рэпрэсій.

**Па-другое**, у красавіку ПЦ Вясна паведаміў, што ім стала вядома аб тым, што людзей, якія зараз знаходзяцца на стадыі апеляцыі перад адпраўкай на «хімію», прымушаюць падпісваць дакумент аб тым, што ў выпадку паўторнага парушэння КК яны могуць быць вывезены за мяжу. І такія выпадкі носяць не адзінкавы характар.

## УМАЦАВАННЕ ТРЭНДУ КАЛЕКТЫЎНАЙ АДКАЗНАСЦІ СВАЯКОЎ «ПАЛІТЫЧНЫХ»

**Па-першае**, улады пачалі прызнаваць экстрэмісцкімі фармаваннямі чаты, у якіх, сярод іншых, камунікуюць сваякі палітзняволеных для абмену карыснай

інфармацыяй. 19 сакавіка экстрэмісцкім фармаваннем быў прызнаны самы вялікі чат сваякоў тых, хто ўтрымліваецца ў папярэднім зняволенні, – СІЗА № 1 Калядзічы. У ім было каля 1800 чалавек – сваякі не толькі палітычных, але і звычайных зняволеных. Такія чаты з'яўляюцца важнай падтрымкай для сваякоў зняволеных з іншых гарадоў, у тым ліку і для сваякоў палітзняволеных, якія жывуць за мяжой і не могуць аператыўна ўдакладніць нешта непасрэдна ў СІЗА. Там абмяркоўваліся парадак адпраўкі перадач, чэргі і г.д. Такі ж статус атрымалі яшчэ 10 тэлеграм-чатаў, 9 вайбер-чатаў і 3 групы ва «УКантакце», якія аб'ядноўвалі родных людзей, якія ўтрымліваюцца ў СІЗА і калоніях.

Умовы ўтрымання палітычных зняволеных і так парушаюць усе магчымыя стандарты, у тым ліку ў частцы адсутнасці паўнавартаснага доступу да інфармацыі для сваякоў. Прызнанне падобнага чата экстрэмісцкім фармаваннем, па-першае, стварае чарговую перашкоду для атрымання інфармацыі з мэтай дапамогі блізкаму чалавеку, што перашкаджае і аказанню такой дапамогі. А па-другое, ставіць пад пагрозу пераследу саміх сваякоў.

Пры гэтым заўважана практыка дадатковага ціску: у чат дадаецца невядомы і дадае бот, якому перадаюцца функцыі адміністратара. Далей пасля кожнага паведамлення бот публікуе ID адпраўніка паведамлення, паказваючы чалавеку, што ён не ананімны.

Важна адзначыць, што пад пагрозай пераследу апынуліся і сваякі звычайных зняволеных, якія складаюцца ў гэтых чатах у колькасці значна большай, чым сваякі палітзняволеных. І для іх таксама цяпер створаны перашкоды для аказання дапамогі сваім блізкім. Такая практыка дэманструе падыход улады, які можна назваць «пабочнымі рэпрэсіямі», пры якім прымальная «пабочная шкода» (ад ваеннага тэрміна collateral damage): калі ў сілу імкнення зрабіць жыццё «палітычных» яшчэ больш нязручным, прамому ціску, пазбаўленню правоў або рызыцы рэпрэсій падвяргаюцца ўвогуле ўсе, хто знаходзіцца побач – у тым ліку людзі, якія не маюць ніякага «палітычнага» профілю.

**Па-другое**, у лютым 2026 г. стала вядома, што з працы звальняюць людзей, чые сваякі жывуць у «недружалюбных краінах». Па інфармацыі журналістаў, аднаго чалавека звольнілі з прадпрыемства абароннай прамысловасці. Аднак ёсць інфармацыя аб падобных выпадках і на іншых прадпрыемствах, не звязаных з гэтай сферай, дзе гаворка ідзе аб непрадаўжэнні кантрактаў або прымусе да звальнення па ўласным жаданні людзей, якія займаюць кіруючыя пасады.

Гэтая практыка з'яўляецца лагічным працягам палітыкі вылучэння асоб з законнымі сувязямі з замежнай дзяржавай у якасці асобнай, пазбаўленай правоў групы.

Мы адзначылі з'яўленне гэтай тэндэнцыі ў нашым аналізе за перыяд з чэрвеня па снежань 2023 года.

Такая практыка — заканамерны працяг палітыкі вылучэння ў асобную, абмежаваную ў правах групу людзей, якія маюць прававую сувязь з замежнай дзяржавай. Мы фіксавалі пачатак развіцця гэтага трэнду ў аналізе за ліпень–снежань 2023 г.

## ІНТЭНСІФІКАЦЫЯ ПРЫЗНАННЯ АРГАНІЗАЦЫЙ / ФАРМАВАННЯЎ ЭКСТРЭМІСЦКІМІ

У першым трыместры 2026 г. інтэнсіфікавалася практыка прызнання арганізацый / фармаванняў экстрэмісцкімі.

**Па-першае**, 14 красавіка стала вядома, што Вярхоўны суд прызнаў Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт «экстрэмісцкай арганізацыяй». Улады абвінавацілі ўніверсітэт у аказанні «метадычнай, фінансавай і іншай» дапамогі «прадстаўнікам радыкальна палітызаваных суполак, а таксама дэструктыўных замежных нда».

Гэта першы выпадак прызнання ў якасці экстрэмісцкай арганізацыі цэлага ўніверсітэта. Адсюль — першы выпадак з наступствамі такога маштабу. Статус экстрэмісцкай арганізацыі азначае, што сам факт наяўнасці дыплома ЕГУ (уключаючы ўсіх выпускнікоў любых праграм) можа стаць падставай для пераследу. Таксама любая публічная сувязь з ЕГУ, уключаючы публічныя лекцыі або сустрэчы працадаўцаў са студэнтамі ў рамках кірмашоў вакансій, можа стаць падставай для пераследу. Зразумела, гэта стварае прамыя рызыкі для дзеючых студэнтаў і выкладчыкаў, а таксама бацькоў, якія аплачваюць вучобу сваіх дзяцей, — многія з якіх не жывуць у эміграцыі і рэгулярна ездзілі ў Беларусь або жывуць там. Аплата вучобы цяпер можа быць кваліфікавана ў якасці фінансавання экстрэмісцкай дзейнасці. Цяпер перад тымі, хто не жыве ў эміграцыі, стаіць выбар: вярнуцца ў Беларусь і жыць пад пастаянным рызыкай пераследу — або вымушана эміграваць. Адсюль выцякае і шэраг праблем з легалізацыяй для студэнтаў, якія пачынаюць адлічвацца з-за страху пераследу: усе яны былі легалізаваны па студэнцкім трэку.

Прызнанне ЕГУ экстрэмісцкай арганізацыяй — таксама частка ўмацавання трэнду «пабочных рэпрэсій», калі праз цэнтралізаваныя і сістэмныя меры пад рызыку пераследу трапляе максімальна шырокае кола людзей.

**Па-другое**, за справаздачны перыяд адбыўся відавочны колькасны ўсплёск прызнання грамадскіх арганізацый / ініцыятыў / супольнасцяў экстрэмісцкімі фармаваннямі або арганізацыямі (усяго 37 пазіцый). Яго пік прыпаў на красавік (23). Пры гэтым на працягу аднаго месяца «экстрэмісцкімі фармаваннямі» былі прызнаны адразу тры праваабарончыя арганізацыі: Беларускі ПЭН, Human Constanta, Беларускі Хельсінкскі Камітэт (гл. заяву праваабарончай кааліцыі з гэтай нагоды).

«Кааліцыйным экстрэмісцкім фармаваннем» былі прызнаны адразу тры беларускія незалежныя кніжныя выдавецтвы, якія працуюць у выгнанні: «Kamunikat.org», «Lohvinau Publishing House», «Andrei Yanushkevich Publishing».

«Экстрэмісцкімі фармаваннямі» былі прызнаны таксама ўсе спісы людзей, якія вылучыліся на выбары ў Каардынацыйную раду.

# III. КЛЮЧАВЫЯ ЗМЕНЫ У РЭАКЦЫЯХ МІЖНАРОДНЫХ СТРУКТУР, ЯКІЯ ТЫЧАЦЦА СІТУАЦЫІ З ПРАВАМІ ЧАЛАВЕКА Ў БЕЛАРУСІ

## ПАЧАТАК РАССЛЕДАВАННЯ МІЖНАРОДНЫМ КРЫМІНАЛЬНЫМ СУДОМ СІТУАЦЫІ ЛІТВА/БЕЛАРУСЬ

12 сакавіка 2026 года стала вядома, што Міжнародны крымінальны суд адкрыў расследаванне сітуацыі Літва/Беларусь, перададзенай у МКС Літвой у верасні 2024 г. Офіс пракурора ўстанавіў, што маюцца разумныя падставы меркаваць, што прымусовыя дзеянні беларускіх уладаў, якія прывялі да дэпартацыі, уяўлялі сабой паводзіны, накіраваныя супраць фактычных або меркаваных апанентаў урада Беларусі і ажыццяўляліся ў адпаведнасці з дзяржаўнай палітыкай або ў яе развіццё. Офіс пракурора прыйшоў да высновы, што меркаваныя злачынствы, здзейсненыя ўладамі, заахвочваліся або ўхваляліся на самым высокім узроўні.

Расследаванне ахоплівае толькі трансгранічныя злачынствы — любыя мінулыя і бягучыя злачынствы, учыненыя з 1 мая 2020 года ў Беларусі, пры ўмове, што прынамсі адзін элемент складу злачынства ажыццяўляўся на тэрыторыі Літвы. Расследаванню падлягаюць злачынствы супраць чалавечнасці, такія як дэпартацыя, а таксама пераслед шляхам дэпартацыі любой ідэнтыфікуемай групы або супольнасці па палітычных падставах, якія ўчынены беларускімі ўладамі.

**МЫ БУДЗЕМ УДЗЯЧНЫ ЗА ЗВАРОТНУЮ СУВЯЗЬ !**

ПІШЫЦЕ НАМ НА OFFICE@BELHELCOM.ORG